Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 22. Варыянт 6**

**Білет 22. Практычнае заданне. Гаспадарчае развіццё беларускіх земляў у XIX - пачатку XX стст.**

**Заданні склалі:**
- Якушаў Аляксей Мікалаевіч, ДУА «Вялікаліпаўская базавая школа» Хоцімскага раёна
- Каткоў Мікалай Васільевіч, ДУА «Забелышынская сярэдняя школа» Хоцімскага раёна
- Напрэева Алена Міхалаўна, ДУА «Сярэдняя школа № 1 г.п.Хоцімска»

Пытанні практычнага задання:

**З апорай на прадстаўленыя крыніцы, адкажыце на пытанні:**

1. З апорай на картасхему (крыніца №1) вызначыце найбуйнейшыя прамысловыя прадпрыемствы ў Беларусі ў пачатку XX стагоддзя;
2. Абапіраючыся на фатаграфію (крыніца № 2) ахарактарызуйце ўзровень развіцця беларускіх гарадоў у канцы XIX стагоддзя;
3. З апорай на картасхему і дыяграму (крыніца №3) зрабіце вывад аб суадносінах розных тыпаў прадпрыемстваў у Беларусі ў канцы XIX стагоддзя;
4. Абапіраючыся на ўсе тры крыніцы вызначыце, ці існавалі ўмовы, неабходныя для паступовага станаўлення капіталізму ў прамысловасці Беларусі ў другой палове 19-пачатку 20 стагоддзяў.

**Крыніца 1**

Карта "Прамысловасць у 1913 годзе"



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца 2**
**Дыяграма**




Соотношение мелкого, мануфактурного и фабричного производства в Беларуси в 1900 г. (по цене произведенной продукции), %

**Крыніца 3**
Фатаграфія



Электрический трамвай в Витебске. Фотография. Конец XIX в.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Адказы:

1. Шклозавод "Нёман", ільнопрадзільная фабрыка "Дзвіна", запалкавая фабрыка "Прагрэс-Вулкан", запалкавая фабрыка "Бярэзіна", запалкавая фабрыка "Везувій"

2. Гарады змянялі сваё аблічча, з'явілася электрычнасць, развіваўся грамадскі транспарт, узнікалі новыя плошчы, вакзалы

3. Нараўне з буйной фабрычнай вытворчасцю развівалася дробная прамысловасць. Працягвалі існаваць мануфактуры, але іх доля зніжалася

4. Рост гарадоў, укараненне на прадпрыемствах машын, будаўніцтва чыгунак і ўкараненне электрычнасці стваралі ўмовы для далейшага развіцця капіталізму